**Г. М. Мятліцкая** УДК 821.161.3.09”19”-1

Кафедра гісторыі беларускай літаратуры, філалагічны факультэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

# МАСТАЦКАЕ АСЭНСАВАННЕ СЯЛЯНСКАГА ЖЫЦЦЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

У артыкуле разглядаецца мастацкае ўвасабленне вясковай тэмы ў беларускай паэзіі пачатку XX ст. Аналізуецца значэнне асноўных вобразаў-сімвалаў, звязаных з семантычным полем «жыццё селяніна», у вершах і паэмах Янкі Купалы, лірыцы Якуба Коласа, Цёткі, Алеся Гаруна.

**Ключавыя словы:** паэзія, мастацкі вобраз, семантыка, селянін, быт, вёска.

**Узор цытавання:** *Мятліцкая Г. М.* Мастацкае асэнсаванне сялянскага жыцця ў беларускай паэзіі пачатку XX стагоддзя // София: электрон. науч.-просветит. журн. 2021. № 1. С. 34–39.

**H. Myatlitskaya**

Department of history of Belarusian literature, faculty of philology, Belarusian State University, Minsk, Belarus

# ARTISTIC COMPREHENSION OF THE LIFE OF A PEASANT IN BELARUSIAN POETRY OF THE EARLY TWENTIETH CENTURY

The article examines the artistic embodiment of the theme of the village in the Belarusian poetry of the early twentieth century. The article analyzes the meaning of the main images-symbols associated with the semantic field «the life of a peasant» in the poems of Yanka Kupala, the lyrics of Yakub Kolas, Ciotka, Ales Harun.



**Keywords:** poetry, artistic image, semantics, peasant, everyday life, village.

**For citation:** Myatlitskaya, H. (2021). Artistic comprehension of the life of a peasant in Belarusian poetry of the early twentieth century. *Sophia*, 1, 34–39 (in Belar.).

**Аўтар:**
**Ганна Мікалаеўна Мятліцкая** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ.
*MyatlitskayaAN@bsu.by*

**Author:**
**Hanna Myatlitskaya** – PhD in philological sciences, associate professor of the department of history of Belarusian literature, faculty of philology, BSU.

Адлюстраванне народнага жыцця з’яўлялася цэнтральнай тэмай беларускай літаратуры пачатку XX ст. Просты чалавек з народа – галоўны герой твораў Цёткі, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Алеся Гаруна, Змітрака Бядулі, Максіма Гарэцкага і іншых тагачасных беларускіх аўтараў. Творцаў цікавілі не столькі індывідуальнасць, непаўторнасць мужыка, колькі яго знітаванасць, злітнасць з народам. Вобраз селяніна абагулены, ён «нясе ў сабе – несвядома і свядома – векавы вопыт беларускага сялянства, набыты на шляхах гісторыі» [4, с. 408]. Акрамя сацыяльнай тэматыкі (пошук волі і долі, прызнанне чалавечай годнасці мужыка-беларуса, апісанне беднасці і бяспраўя,

абуджэнне народа ад сну, заклік да змагання), увага творцаў накіравана на раскрыццё ўнутранага свету селяніна (лад думак, спадзяванняў, рысы характару: цярплівасць, працавітасць, пакорнасць), да таго ж у творах класікаў увасабляюцца і паступова пачынаюць дамінаваць агульначалавечыя тэмы, вобразы і матывы, – найперш гэта тэма радзімы (матыў патрыятызму), тэмы паэта і паэзіі, прыроды і кахання.

Пачатак ХХ ст. – мяжа паміж старым ладам і новым, калі яшчэ захоўваецца нешта з ранейшага, але і многае змяняецца, адыходзіць у нябыт. У літаратуры таго часу знаходзім адлюстраванне такіх рэалій жыцця беларускага народа, якія потым імкліва зменяцца ў паслярэвалюцыйнай, савецкай рэчаіснасці, перш за ўсё гэта рэаліі, што склаліся раней, яшчэ ў часы прыгону. Менавіта праз паказ гэтых рэалій творцы імкнуліся дапамагчы народу абудзіцца, змяніць светапогляд.

Натуральна, што «іменна да селяніна звяртаецца ўсё беларускае мастацтва слова, каб прасвятліць яго душу, адукаваць, прылучыць да высокіх ідэалаў і павесці за сабой. Літаратура ставіць перад сабой задачу адкрыць селяніну вочы на складаны навакольны свет, каб ён ведаў праўду часу. Але гэта можна было зрабіць толькі праз глыбокае раскрыццё яго ўласнага ўнутранага свету, праз самапазнанне селяніна» [3, с. 128].

Адзін са спосабаў уздзеяння на чытачоў – маналог ад імя селяніна. У Янкі Купалы, напрыклад, вобразы лірычнага героя і селяніна часам супадаюць. Твор атрымліваецца як бы і пра селяніна, і пра лірычнага героя ў адной асобе («Думкі», «Па жыццёвай пуцявіне», «Ой, чаму на хаты гэтыя?..»). Даволі часта, карыстаючыся прыёмам мастацкага пераўвасаблення, паэт звяртаецца да сялян-мужыкоў ад імя такога ж, як і яны, бедака. Асобныя вершы Цёткі таксама напісаны ад імя мужыка («Мужыцкая доля», «Вера беларуса» і інш.).

Беларускія вёскі (сёлы) убогія. Яны выглядаюць бедна не толькі таму, што ў іх мала садоў, «толькі часам дзе бярозкі, // Як тычкі, стаяць» [6, с. 192], але найперш таму, што хаты ў іх – таксама ўбогія. Разгорнутае апісанне жыцця вёскі знаходзім у паэме Янкі Купалы «Адплата кахання» [7, с. 33, 35, 36], дзе адзначана, што ў вёсцы толькі знешне ўсё выглядае спакойным і ціхім, а на самай справе гэта не так. У вершы Якуба Коласа «Вёска» аўтар для адлюстравання беднасці і ўбогасці жыццёвай прасторы прыводзіць пералік сялянскіх прадметаў побыту і адзначае, што ў вясковых хатах надзейна асталяваліся нуда, хваробы, смерць дзяцей, «тут дабра не бачыць зроду, // Тут марнее гаспадар» [5, с. 35]. Сімвалічнае значэнне набываюць прылады працы (саха, каса, сякера) у творах Янкі Купалы, а хата, нягледзячы на тое, што яна нізкая, пахілая, крывая, для селяніна – самае каштоўнае, што ў яго ёсць.

У вершы «Наш родны край» Якуб Колас называе Беларусь «бедным», «забытым богам» краем, адзначае, што «туманы, як пялёнка, // Засцілаюць лес і гай», апісвае жыццё народа, знясіленае цяжкой працай. У вёсцы «сцішна, нудна, бы ў астрозе // Ці на могілках якіх» [5, с. 22]. Верш заканчваецца зваротам:

Край наш родны, бедна поле!
Ты глядзіш, як сірата,
Сумны ты, як наша доля,
Як ты, наша цемната.
[5, с. 22]

У вершы Якуба Коласа «Мужычае жыццё» адлюстравана неўпарадкаванасць сялянскага побыту, асобныя адмоўныя моманты з жыцця вяскоўцаў сабраны разам і нават перабольшаны («Што за жыцце, што за доля // Проста плач бярэ і смех!» [5, с. 60]).

Сумная выснова верша – у жыцці няма змен, яно праходзіць у штодзённай мітусні: «Так і век ператаўчэшся, // І няма таго дабра, // Покі жыць ты прыбярэшся – // Паміраць табе пара» [5, с. 60].

Тагачаснае сацыяльнае становішча беларускага селяніна добра апісаў Кузьма Чорны: «Працоўныя беларусы неслі на сабе прыгнёт не толькі сацыяльны, але і нацыянальны. Царызм вёў палітыку трымаць беларусаў у стане „ціхай пакорлівай масы“. З пункту погляду царскіх чыноўнікаў, само паняцце „беларус“ было паняццем этнаграфічным і ні ў якім разе не нацыянальным. Жыццё ў беспрасветнай, галоднай працы, бяспраўе, беззямелле і малазямелле, адсутнасць доступу да пісьменнасці ставілі беларускага простага чалавека ў стан, які характарызуецца прыказкаю самога ж народа: „Ні госць, ні гаспадар у сваім доме“» [9, с. 14].

Янка Купала на фоне паказу народнай беднасці спецыяльна ідэалізуе мінулае, «час, у яком… кіпела жыццё»:

Свой народ быў кругом
І любіў сваё ўсё!

Сваю песню ў лад свой
Не стыдаўся запець,
І сярмяжкі сівой
Не стыдаўся надзець!

Весяліўся народ,
Аж грымела сяло!
Ва ўсіх светлы паглёд,
Ва ўсіх шчасце цвіло.
(«Над сваёй Айчызнай»)
[6, с. 89–90]

«Гэта не простае апісанне былога, але і адказ на пытанне: чаму слаўнае жыццё змянілася на нешчаслівае і пакутнае? Пясняр з болем гаворыць пра той час: „Знікла ўсё, як імгла, // Няма славы таей; // Злая доля змагла // І мой край, і людзей!“» [6, с. 90]. Лірычны герой не прымае тагачасную рэчаіснасць, хоча бачыць свой народ шчаслівым, а свой дом (айчызну) не такім знявечаным, загубленым.

У вершы «***Ты, мой брат, каго зваць Беларусам…» з прысвячэннем «У чатырохлецце „Н[аша]е нівы“» Алесь Гарун таксама расказвае пра слаўнае мінулае беларусаў, іх вядомасць у свеце, разважае над прычынамі, чаму таленавіты і працавіты народ так гаротна жыве.

У творах Янкі Купалы выяўляецца і балючае перажыванне з-за людской пагарды да мовы, яго мара – вярнуць народу песні на беларускай мове, «па-сваёму» («Хоць ты, сэрца, лопні, трэсні…»). Шмат вершаў пра неабходнасць шанавання беларускай мовы напісаў Алесь Гарун («Гімн роднай мове», «Прывітанне», «***Ты, мой брат, каго зваць Беларусам…» і інш.).

Характар і светапогляд селяніна раскрываюцца ў вершы Цёткі «Мужык не змяніўся». Паэтэса адзначае, што яго хвалююць толькі матэрыяльныя патрэбы, а таму яна імкнецца данесці да чытачоў думку: з часу нараджэння Хрыста многае перамяніліся ў жыцці, але селянін не змяніўся, ён так і не разумее, што акрамя матэрыяльнага ёсць і духоўнае.

Галоўная рыса сялянскага характару – імкненне і любоў да працы. Вобраз рук селяніна сімвалізуе яго працавітасць і сілу. Працы ў чалавечым жыцці спадарожнічаюць як шчасце, радасць, так і гора, пакуты. Пры апісанні цяжкой вясковай працы паэты

свядома падкрэсліваюць звязаныя з ёй нягоды. Так, у творах Янкі Купалы адзначаецца, што хоць селянін вечна працуе, «век потам абліты» [6, с. 69], бывае, што ён застаецца без ураджаю. Прыродная сіла ў адзін дзень можа знішчыць усю яго працу, усе яго надзеі, асудзіць сям'ю мужыка на галодную зіму («Град»). Камяністая, сухая зямля мала радуе. Колькі ні ўкладвай сіл, ураджай атрымліваецца невялікі. Непасільная бясконцая праца выклікае хваробы, прычыняе селяніну мноства пакут.

У вершы Цёткі «Вера беларуса» гаворыцца, што потам палітая ніва беларусаў (і гэтым нібыта запомніцца пачатак XX ст.) увойдзе ў гісторыю. Падобнае пра поле і працу селяніна чытаем і ў творах Якуба Коласа: «Многа тут працы і поту гарачага, // Сілы, здароўя мужык палажыў!» («Роднае поле»).

Праз паказ неўрадлівасці і беднасці палёў у вершах Якуба Коласа адлюстроўваецца беднасць сялян. Як выдатны паэт-пейзажыст ён прыводзіць мноства дэталей: «Нудна ў полі … марнеюць нівы», «вузенькаю ніццю йдуць палоскі» [5, с. 30], паны адвялі сялянам «пусташы, каменне», што мужык са свайго засеву «не збярэ насення» [5, с. 30]. Поле надзелена эпітэтамі «ўбогае», «пясчанае», «потам абмытае», на ім вырастае толькі «дзікае зелле», бо зямля – адзін пясок і каменні, колькі працы ні ўкладай («Роднае поле»). У вершы «Мужычая ніва» паэт паказвае, што ніва «зрасла … густа // Дзікаю травою» [5, с. 46], на ёй растуць зелле, бярозка, сінія валошкі, палыны на межах, адзначае, што навальніца з градам знішчылі каласы. У канцы твора аўтар спрабуе асэнсаваць прычыну неўраджайнасці поля: магчыма, гэта ад таго, што поле паліта-прасолена людскімі слязамі. У Якуба Коласа ёсць і асобны твор, прысвечаны вобразу слёз селяніна, якія скандэнсавана ўвасабляюць народныя пакуты, – верш «Людскія слёзы».

Як піша Э. Дубянецкі: «Што датычыцца глебавага покрыву Беларусі, то неабходна зазначыць, што глебы нашай Бацькаўшчыны характарызуюцца значнай „стракатасцю“ (усяго вылучана амаль 100 глебавых разнавіднасцяў), прычым пераважаюць дзярнова-падзолістыя, дзярнова-забалочаныя і сугліністыя глебы. У той жа час, акрамя вышэйпералічаных „спрыяльных“ для жыцця чалавека глебаў, ёсць таксама „неспрыяльныя“ пясчаныя і супясчаныя глебы, якія ва ўсе часы значна ўскладнялі працу беларусаў. Але такія неспрыяльныя ўмовы ў пэўнай ступені выпрацоўвалі ў нашых продкаў „цягавітасць“, узмацнялі сілу волі» [2, с. 348].

Земляроб заўсёды перажывае за сваё поле, за пасеяны хлеб, яго гнятуць «мужыцкія думы»: што вырасце з яго працы? ці зможа ён заплаціць падаткі? як давядзецца зімаваць? Толькі ў свята ў людзей – «думкі шчасны», а ў будзённым жыцці не да іх. Так без радасці і адпачынку доўжыцца сялянскае жыццё. Амаль усё сабранае ўвосень даводзіцца аддаваць: воласці чынш, даўгі «магазынніку».

Дабрабыт чалавека ў паэзіі Янкі Купалы сімвалізуе хлеб. Настае сапраўдная беднасць, калі ў хаце «няма хлеба, няма солі» [6, с. 205], а зімой – яшчэ і дроў. Таму галоўны клопат селяніна, каб хлеб заўсёды быў. Калі яго няма – голад, тады хлеб – «зёлкі ды салома, // І таго няма ў клеці…» («Кепска…»), тады даводзіцца прасіць хлеба ў людзей («Ах, ці доўга…»). Паэт з болем адзначае, што бясхлеб'е зведаў кожны селянін. Таму яго лірычны герой жадае працаўнікам, каб іх жыта было густым («Як пайду я, пайду…»). Беларускаму народу патрэбен, акрамя ўсяго іншага, і духоўны хлеб – веды [6, с. 128].

У вершы Якуба Коласа «Нёман» згадваецца пра цяжкое жыццё сялян (рыбакоў, касцоў), якое бачыў, «чуў» Нёман. Рака ўспрымаецца паэтам адухоўлена, у творы

на фоне апісання прыроды праступаюць асобныя дэталі сялянскага жыцця. У канцы верша лірычны герой выказвае Нёману просьбу: «Раскажы ж другому краю, // Як у нас жыве народ» [5, с. 26]. Спалучэнне апісанняў навакольнай прыроды і паказу цяжкасцей сялянскага жыцця знаходзім і ў яго вершах «Дарога», «Хмары».

Скептычнае абмеркаванне сялянамі чуткі, што ім «зямлі дадуць», Якуб Колас прыводзіць у вершы «Што, брат Грышка, папраўляйся…», галоўная думка якога выказана паэтам адкрыта і смела: «Не, не будзе нам жыцця, // Як паноў не перавешаць» [5, с. 63].

Жаданне тагачасных паэтаў палегчыць народнае жыццё часам перадаецца ў выглядзе мары пра цудоўнае пераўтварэнне. Прыгадаем блізкія па змесце верш Цёткі «Мае думкі» і верш Янкі Купалы «Каб я князем быў…». Купалаўскі лірычны герой выказвае думкі-мары пра тое, што калі б ён быў рэчкай (князем і інш.), то ён змыў бы народную бяду. У вершы Цёткі выказаны жаданні быць пшанічным зернем, каб даць простым людзям смачны хлеб, рэчкай, каб з неба сонца скрасці і даць людзям святло. У цэлым паэзіі Цёткі ўласцівы вобразы, звязаныя з тэмай абуджэння самасвядомасці народа, актуальныя для рэчаіснасці пачатку ХХ ст. Сярод іх такія сімвалічныя вобразы, як сон, цемра, мора, бура, сонца, путы, якія ў многіх творах паэтаў-нашаніўцаў становяцца дамінантнымі.

Разважанні пра долю дзіцяці, народжанага ў сялянскай сям'і, знаходзім у вершах-«калыханках» – «Над калыскай» («Спі, маленькі мой сыночак!..») Янкі Купалы і «Песня над калыскай» Якуба Коласа. Купала падкрэслівае, што пакуты наканаваны селяніну ўжо пры яго нараджэнні. Маці разумее ўсе цяжкасці працы, прадчувае, калі вырасце дзіця, яго «сілы зломіць змора, // Спёка ды мароз». Матчына песня над калыскай сумная, бо ў будучым жыцці сына яна не бачыць радасці. Маці ведае, што яго чакаюць два шляхі: сумленны шлях – гэта гора, беднасць, служба ў царскім войску, праца ў пана або несумленны – гэта навучыцца красці, стаць вялікім панам і быць чужым на роднай зямлі, сярод блізкіх людзей. У творы Якуба Коласа маці спявае сыну, каб той не плакаў, бо дарэмна патраціць сілу, а без сілы жыць на свеце цяжка. Адмоўныя (песімістычныя) разважанні аб ягонай будучыні (што будзе працаваць на чужым полі, стане паднявольным у пана) аптымістычна змяняюцца надзеяй, што, магчыма, яе сын пойдзе ў школу і стане чалавекам, бо «без навукі цяжка жыць // Гэтым трудным векам» [5, с. 37], а адвучыўшыся – будзе шчаслівым. Колас разумее, што для селяніна на пачатку ХХ ст. імкненне да ведаў, вучобы – гэта сапраўдны шлях у людзі, магчымасць вырвацца з беднасці, нядолі.

Прадметы вясковага побыту і мясціны, дзе праходзіць сялянскае жыццё, набываюць асаблівы сэнс. З імі звязаны галоўныя пачуцці і найважнейшыя жыццёвыя падзеі. Мужык адносіцца да іх па-добраму, уважліва і ашчадна, ён любіць тое, што бачыць навокал, і ўспрымае жыццёвыя праявы адухоўлена: не толькі прадметы, але і навакольныя мясціны. Сакральнае стаўленне да свайго роднага і патрыятызм выразна выяўляюцца ў творах Я. Купалы «Гэта крык, што жыве Беларусь», Цёткі «На чужой старонцы» і інш.

Як бачна, у паэзіі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі, Алеся Гаруна назіраецца блізкасць тэм, матываў, вобразаў, лёгка выяўляюцца паралелі паміж асобнымі вершамі, у якіх адлюстроўваюцца беднасць і іншыя цяжкасці жыцця беларускага народа. Адмоўнае ў побыце селяніна паэты паказвалі не як выпрабаванні ў жыцці асобнага чалавека, а як вынік (і асэнсаванне) агульных несправядлівых умоў быцця. Пры апісанні вясковага жыцця ў творчасці Янкі Купалы, Цёткі, Алеся Гаруна акцэнт у асноўным

зроблены на сімвалічных вобразах і дэталях, а Якуб Колас як выдатны паэт-пейзажыст уключыў сацыяльнае, побытавае, у паказ прыродных з'яў.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Гарун, А.* Сэрцам пачуты звон: Паэзія, проза, драматургія, публіцыстыка / А. Гарун; уклад. У. Казбярук. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 359 с.

2. *Дубянецкі, Э.* Беларускі нацыянальны характар: сутнасць і вытокі / Э. Дубянецкі // Беларусіка=Albaruthenica. – Кн. 5. Культура беларускага замежжа: Беларуска-амерыканскія гістарычна-культурныя ўзаемадачыненні / Міжнар. асац. беларусістаў, Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф. Скарыны, Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»; Рэд.: У. Конан, А. Мальдзіс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – С. 341–353.

3. *Каваленка, В. А.* Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. А. Каваленка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 320 с.

4. *Калеснік, У. А.* Мужык у творчасці Янкі Купалы / У. А. Калеснік // Янка Купала. Энцыкл. даведнік / БелСЭ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1986. – С. 408–410.

5. *Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Т. 1. Вершы 1898–1917 / рэд. Ю. Пшыркоў. – Мінск: Маст. літ, 1972. – 562 с.

6. *Купала, Я.* Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Т. 1. Вершы. Пераклады 1904–1907 / рэд. У. В. Гніламёдаў. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 462 с.

7. *Купала, Я.* Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Т. 6. Паэмы. Пераклады / рэд. М. І. Мушынскі. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 430 с.

8. *Цётка*. Выбраныя творы / Цётка. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 336 с.

9. *Чорны, К.* Вялікае жыццё / К. Чорны // Такі ён быў. Успаміны пра Янку Купалу. – Мінск: Маст. літ., 1975. – С. 13–25.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 15.01.2021.*